Аляксандр РАДЗЬКОЎ

# РЭКТАРЫ: урыўкі з новай кнігі

Слова пісьменніка




З часам я даведваюся, што працягваецца падрыхтоўка з'езда настаўнікаў. Мяне з гэтай нагоды не трывожаць, пра маё выступленне на з'ездзе ніхто не гаворыць, я спакойна займаюся сваёй працай. На з'ездзе мяне запрашаюць у прэзідыум. Я лічу гэта ацэнкай маёй працы ў час выбараў Прэзідэнта. Адчуваю сябе добра, ужо ведаю многіх рэктараў, вітаюся з імі, абменьваюся ўражаннямі. Але ў перапынку да мяне падыходзіць начальнік упраўлення выхаваўчай работы Міністэрства адукацыі Георгій Аляксеевіч Бутрым:

— Аляксандр Міхайлавіч, вы заўтра выступаеце на з'ездзе?

Я шакіраваны нечаканасцю пытання. Мне пра гэта ніхто не сказаў! А заўтра з'езд працуе ў прысутнасці Прэзідэнта. Кажу Бутрыму:

— Першы раз ад вас чую! Адкуль вам гэта вядома?

— Сам бачыў вас у спісе выступоўцаў!

У прэзідыуме пытаюся ў Брыгадзіна:

— Гэта праўда, што я заўтра выступаю?

— Так! — пацвярджае міністр. — Скажаш некалькі слоў.

Пасля гэтага я ад работы з'езда адключыўся, не пайшоў на секцыйныя пасяджэнні, адмовіўся ад вячэрняга прыёма ў міністра для рэктараў. Рыхтаваўся да выступлення. Канчатковы варыянт у мяне склаўся да чатырох гадзін раніцы. І ні з кім жа не параішся, нікога не запытаеш. Выступаў я па рэгламенту дзесяць хвілін, гаварыў пра задачы камплектацыі настаўнікамі сельскіх школ, пра мэтавы прыём абітурыентаў, пра вартаснае забеспячэнне якасці вучэбнага працэса ў ВНУ, ПТВ і школах. Відаць, мае думкі былі сугучны з тым, што думаў з гэтай нагоды Прэзідэнт. У сваім выступленні ён некалькі разоў на мяне спаслаўся, пагадзіўшыся з маімі довадамі. У гэты дзень з'езда я як выступоўца таксама сядзеў у прэзідыуме, і пасля абвяшчэння перапынку да мяне падышоў Аляксандр Рыгоравіч. Запытаўся:

— Ты ўжо перайшоў?

Я зразумеў, што Прэзідэнт у курсе ўсіх маіх спраў. Адказваю:

— Аляксандр Рыгоравіч, я ж толькі пачаў працаваць рэктарам. Мы вызначылі планы развіцця ўніверсітэта, калектыў іх падтрымаў, мне паверылі. Трэба ж хоць бы нейкія рэзультаты атрымаць!

— Колькі ты працуеш рэктарам?

— Яшчэ сем месяцаў.

— Ужо сем месяцаў? Пераходзь на прапанаваную пасаду, а пасля і далей паглядзім.

Усё вырашана. Я зразумеў, што пераход на пасаду намесніка міністра непазбежны. Мне выдалі медыцынскую даведку на прафесійную прыгоднасць, я прайшоў усе ўзгадненні, заставалася толькі сустрэча з Прэзідэнтам перад прызначэннем. Але за дзень да гэтага мяне запрашае Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Урал Рамдракавіч Латыпаў і кажа, што Прэзідэнт дае мне магчымасць яшчэ папрацаваць рэктарам. Як жа мне былі патрэбныя і карысныя гэтыя тры гады ва ўніверсітэце. Яны далі мне надзвычай неабходны ў далейшым жыцці вопыт працы першай асобай.

Маё прызначэнне міністрам адукацыі ў жніўні 2003 года таксама было нечаканым і імклівым, на працягу трох дзён. Брыгадзін сам папрасіўся ў адстаўку, што дапамагло мне на першым часе выбудаваць адносіны з апаратам міністэрства, а з Пятром Іванавічам захаваць сяброўства да яго апошніх дзён.

У размове пры маім прызначэнні Прэзідэнт запытаўся, каго я бачу сваім пераемнікам. Я назваў дзве кандыдатуры — першага прарэктара прафесара М. І. Вішнеўскага і рэктара Інстытута павышэння кваліфікацыі дацэнта К. М. Бандарэнку. Аляксандр Рыгоравіч падрабязна распытаў пра абодвух. Міхаіл Іванавіч у большай ступені бачыўся кіраўніком-вучоным, Канстанцін Міхайлавіч — кіраўніком-гаспадарнікам. Пры гэтым я выказаў сваю пазіцыю, што рэктарам павінен быць доктар навук. Прэзідэнт ведаў Бандарэнку яшчэ са студэнцкіх гадоў — яго армейскае мінулае ў пагранічных войсках, выдатную вучобу, настойлівы характар, актыўную працу ў яго палітычнай камандзе яшчэ на прэзідэнцкіх выбарах у 1994 годзе. Таму з нагоды доктарскай дысертацыі заўважыў: захоча — зробіць! Рэктарам быў прызначаны Бандарэнка. На гэтай пасадзе ён працаваў 14 гадоў, вельмі шмат зрабіў для развіцця ўніверсітэта, асабліва яго матэрыяльнай базы. І абараніў па гісторыі расійскіх палітычных партый доктарскую дысертацыю, нават адкрыў ва ўніверсітэце савет па абароне кандыдацкіх дысертацый для гісторыкаў.

З Косцем мы сябравалі яшчэ са студэнцкіх гадоў, але кіравац універсітэтам я яму не перашкаджаў. Здаралася, што рабіў заўвагі за пралікі, але пры гэтым ніколькі не саромеўся, бо ў свабодзе яго не абмяжоўваў. Некаторыя рашэнні ён прымаў не так, як я, часам іначай расстаўляў акцэнты. Гэта ўжо быў іншы рэктар, можа быць, у нечым горшы, але ў нечым і лепшы за мяне. Рэктарам ён працаваў з 2003 па 2017 год. Сышоў з гэтай пасады сам, са мною не раіўся. На маё шчырае здзіўленне з гэтай нагоды адказаў: проста стаміўся. У пераемнікі прапаноўваў свайго вучня — першага прарэктара, доктара гістарычных навук, прафесара Дзмітрыя Сяргеевіча Лаўрыновіча. Але кіраўніцтва вырашыла інакш: рэктарам Магілёўскага ўніверсітэта прызначылі першага прарэктара Полацкага ўніверсітэта, доктара гістарычных навук Дзяніса Уладзіміравіча Дука. Рэктар Полацкага ўніверсітэта Дзмітрый Мікалаевіч Лазоўскі выказваў з гэтай нагоды шкадаванне — ён рыхтаваў Дука на сваё месца. А мой універсітэт цяпер працягвае сваё развіццё пры новым кіраўніку.

Калі я працаваў ужо памочнікам Прэзідэнта, у размове са мною Аляксандр Рыгоравіч сказаў:

— Пагадзіся, што адна з самых прывабных для цікавай працы пасад — рэктарская.

Я сказаў:

— Я працаваў рэктарам, таму магу пацвердзіць вашу думку. Болей таго, шчыра скажу, калі б не да вас, то міністрам з пасады рэктара ніколі б не пайшоў!

Прэзідэнт на гэта толькі ўсміхнуўся.

## Рэктары галоўнай педагагічнай ВНУ

Так склалася, што найболей для мяне блізкім, пасля Магілёўскага педінстытута, стаў Мінскі дзяржаўны педагагічны інстытут імя М. Горкага, пазней Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя М. Танка (БДПУ). Там я вучыўся ў аспірантуры, абараняў кандыдацкую і доктарскую дысертацыі, удзельнічаў у шматлікіх навуковых канферэнцыях. Зразумела, што з цягам часу набіраў у гэтым універсітэце блізкіх сяброў. Да мяне першапачаткова прыязна ставіліся загадчык кафедры матэматыкі і методыкі яе выкладання І. А. Новік, прафесар-алгебраіст Л. Б. Шнеперман, дэкан матэматычнага факультэта прафесар-геаметр А. Б. Васілеўскі, франтавік, прафесар-педагог М. К. Сцепаненкаў. Стасункі з імі як з настаўнікамі непрыкметна перараслі ў дружбу. Надоўга сяброўскія адносіны завязаліся з маімі равеснікамі, аднакашнікамі па аспірантуры, нарэшце, што цалкам натуральна, не толькі з фізікамі-матэматыкамі. Ужо прарэктарам я сыйшоўся з прарэктарам па навуковай рабоце Васілём Аляксандравічам Бондарам. Выдатны фізік, пераканаўчы настаўнік, аўтар многіх вучэбных дапаможнікаў для школьнікаў і студэнтаў, да ўсяго астатняга мінчанін — мне з ім было заўсёды і ва ўсім надзвычай цікава. Разумны, вытрыманы, інтэлігентны, ён адчуваў усе глыбінныя цячэнні як ва ўніверсітэце, так і ўвогуле ў краіне. А час развіцця нашай дружбы быў гарачым, гэта пачатак дзевяностых! Час краху ранейшых ідэалаў і няўклюдныя спробы пошуку новых. Памятаю, як аднойчы мы стаялі ля акна яго кабінета ў шматпавярховіку на плошчы Незалежнасці і моўчкі пазіралі на натоўп людзей, якія доўга хадзілі замкнутым колам на гэтай плошчы і агрэсіўна нечага патрабавалі. Мы абодва ўсведамлялі правакацыйнасць намеры арганізатараў такіх мерапрыемстваў і цяжка ўздыхалі, разумеючы сваю бездапаможнасць у тым, каб спыніць дзеянні дэканструктыўна настроенага натоўпу.

Васіль Аляксандравіч навучыў мяне прадбачыць магчымыя козні, правакацыі нават з боку блізкіх сяброў, асабліва калі ты яшчэ і іх кіраўнік. Напрыклад, ён не прыйшоў на мой банкет пасля абароны доктарскай дысертацыі. На самой абароне, канешне ж, быў, павіншаваў, а на традыцыйны з гэтай нагоды банкет не пайшоў. Усе ж ведалі пра нашу дружбу, а ён не прыйшоў. Толькі з-за таго, што як прарэктар курыраваў работу ўсіх саветаў па абароне дысертацый, а банкеты тады катэгарычна не віталіся. І быў жа абсалютна правым! Колькі светлых галоў паляцела пасля заяў «добразычліўцаў» аб удзеле кіраўніка ў калектыўнай п'янцы. Дарэчы, у мяне з банкетам з нагоды прысваення вучонай ступені кандыдата навук таксама была гісторыя, з якой я так да канца і не разабраўся. Але гісторыя надзвычай непрыемная.

У савецкі час рашэнне аб прысуджэнні вучонай ступені на аснове хадайніцтва спецыялізаванага савета прымаў ВАК СССР. Працэдура доўгая і даволі нервовая. Абарона, пасля месяц на афармленне дакументаў, іх перасылка ў Маскву (з усяго Савецкага Саюза), чаканне разгляду (а магчыма, яшчэ і экспертная ацэнка), затым зваротнае падарожжа дакументаў. На ўсё гэта сыходзіў, як правіла, год. Але ступень прысуджалася з дня абароны дысертацыі ў савеце, з гэтага часу налічвалася і адпаведная надбаўка да заробку. За грашовую розніцу, якаяназбіралася, трэба было для калег арганізаваць банкет. У мяне ў дакладнасці так і атрымалася, і для банкета я за месяц замовіў магілёўскі рэстаран «Колас». Гэта быў 1983 год, востры дэфіцыт прадуктаў, але пад гэтыя мэты рэстарану выдзяляліся адпаведныя квоты. Узгадніўшы з адміністратарам рэстарана час, колькасць удзельнікаў, меню, я спытаўся, ці трэба ўдакладняць напярэдадні гатоўнасць рэстарана да правядзення банкета. Мне сказалі, што мы ўсё падрабязна абгаварылі, праблем яны не бачаць ніякіх, збірайце праз месяц, у суботу ў 17 гадзін, сваіх гасцей. Усё будзе ў парадку. Але за два дні да вызначанага часу я ўсё ж такі патэлефанаваў адміністратару, каб лішні раз пераканацца ў гатоўнасці рэстарана да майго ўрачыстага мерапрыемства. А яна мне гаворыць:

— Вы ж адмянілі свой банкет! Мы нічога і не гатуем!

Я проста анямеў:

— Як адмянілі? Я ж у вас нават не быў!

— Вы званілі мне па тэлефоне, прадставіліся і сказалі, што па непрадбачаных абставінах банкет адмяняецца.

— І вы на аснове гэтага тэлефоннага званка спынілі падрыхтоўку?

— У нас такая сітуацыя ўпершыню! А вам, Аляксандр Міхайлавіч, я раю болей уважліва вывучыць, хто ў вас у сябрах!

Банкет, зразумела, адбыўся, але я і цяпер не ведаю, хто і чаму так паступіў.

**Пераклаў з рускай мовы Кастусь ЛАДУЦЬКА.**

*(Працяг будзе 6 жніўня.)*

*(Працяг. Пачатак у нумарах за 26 сакавіка; 2, 9, 16, 23, 30 красавіка; 7, 14, 28 мая, 11 чэрвеня; 9, 16, 23 ліпеня.)*